ПАДЗЕЯ

# СЛОВА ПАМЯЦІ СВЯШЧЭННАЙ

**Працягваецца цыкл грамадскіх прэзентацый сумеснага літаратурна-асветніцкага праекта Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі і Гродзенскага гарадскога савета ветэранаў – кнігі «Памяці вечны агонь» *(2024)*, зборніка літаратурна-мастацкіх твораў, прысвечаных 80-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**




Чарговай лакацыяй для знаёмства з новай кнігай стаў Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт. 18 сакавіка па запрашэнні бібліятэкі вышэйшай навучальнай установы тут высадзіўся дэсант з гродзенскіх літаратараў, суаўтараў зборніка. У складзе дэлегацыі: гродзенская паэтэса Вольга Алізар; паэтэса, перакладчык Антаніна Нурэтдзінава; члены Гродзенскага гарадскога літаратурнага аб’яднання «Надзея», паэтэса Таццяна Лугавая і паэт, празаік, публіцыст Станіслаў Вішнеўскі, а таксама рэдактар кнігі, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык. «Пакуль жывая наша памяць, у нас ёсць будучыня. Пакуль мы гаворым і пішам пра вайну, мы ў сілах зберагчы мірнае неба над нашым домам», – з такіх слоў, адрасаваных перш за ўсё моладзі, пачаў прэзентацыю кнігі Дзмітрый Мікалаевіч.

Нагадаем, што кніга выйшла ў канцы мінулага года, года 80-й гадавіны вызвалення Беларусі, і цяпер, у год 80-годдзя Перамогі ваенна-патрыятычная тэматыка твораў, якія складаюць зборнік, надзвычай актуальная. Кожная такая сустрэча-прэзентацыя – гэта ўрок мужнасці, неабходны і надзвычай карысны дзякуючы свайму асветніцкаму, выхаваўча-патрыятычнаму эфекту. Выбар на карысць моладзевай аўдыторыі для прэзентацый мае ўніверсальнае значэнне. Па-першае, маладыя людзі даведваюцца пра новыя трагічныя старонкі гісторыі, пра новыя эпізоды гераізму адзінага савецкага народа, пераможцы фашызму, пра мужнасць нашых продкаў, а таксама ў ходзе тэматычных літаратурных мерапрыемстваў атрымліваюць інфармацыю пра дзейнасць Саюза пісьменнікаў Беларусі, пра літаратурнае жыццё Прынёманскага краю як неад’емную

частку айчыннай культуры і пра магчымасці прыняць у ім удзел. Вось і цяпер ва ўніверсітэцкай канферэнц-зале на літаратурным мерапрыемстве прысутнічалі дзве групы будучых аграрыяў.



Што мы можам супрацьпаставіць спробам аспрэчыць ісціну і сфальсіфікаваць гісторыю Вялікай Айчыннай вайны? Пісьменнікі Гродзенскай вобласці актыўна распрацоўваюць у сваіх творах сакральны матыў памяці, максімальна актуалізуюць тэматыку гістарычнай праўды, якой бы трагічнай і горкай яна ні была (да юбілею Перамогі намі ўжо рыхтуецца выданне новай тэматычнай кнігі «Память огненных лет»). Будзем спадзявацца на тое, што старонкі неўміручай памяці і болю, якія былі агучаны літаратарамі на сакавіцкай сустрэчы ў Гродзенскім дзяржаўным аграрным універсітэце, атрымаюць водгук у сэрцах юных беларусаў. А кніга, падораная гасцямі, будзе карыстацца попытам у наведвальнікаў бібліятэкі ўніверсітэта.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** падчас прэзентацыі кнігі «Памяці вечны агонь», зборніка літаратурна-мастацкіх твораў, прысвечаных 80-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт. 18 сакавіка 2025 года.



Прывітальнае слова ад гаспадароў



Прывітальнае слова ад калектыву аўтараў зборніка



Руская паэтэса з Гродна Таццяна Лугавая



Аўтар нарыса Станіслаў Вішнеўскі




ГГАУ





Гучаць беларускія вершы ад Вольгі Алізар



Паэтэса, перакладчык Антаніна Нурэтдзінава








ГГАУ

Гучыць нарыс ад Дзмітрыя Радзівончыка



ГГАУ







Студэнты зрабілі прыемнае пісьменнікам – прадэкламавалі вершы гродзенскіх аўтараў Людмілы Шаўчэнкі і Людмілы Кебіч з кнігі «Памяти вечный огонь»






ГГАУ

www.pisateli.by